© 2021 Katedra Białorutenistyki UW. Wydanie w otwartym dostępie na licencji **CC BY-NC-ND** (https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/4.0/deed.pl)

ACTA ALBARUTHENICA 21: 2021
DOI: 10.32612/uw.18988091.2021.21.pp.231–247

Марына Свістунова / Maryna Svistunova

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт /
Belarusian State University
ORCID: https://orcid.org/0000-0001-8856-9530
e-mail: svistunovami@bsu.by

Філолагі Варшаўскага ўніверсітэта XIX – пачатку XX ст. аб пісьмовай традыцыі беларускай мовы

Philologists of the University of Warsaw of the XIX – begining of the XXth centuries about the written tradition of the Belarusian language

Filologowie Uniwersytetu Warszawskiego XIX – początku XX wieku o tradycji pisemnej języka białoruskiego

Філалагічныя даследаванні ў Варшаўскім універсітэце маюць даўнія, трывалыя і надзвычай багатыя традыцыі. Падчас заснавання і пачатку працы Каралеўскага Варшаўскага ўніверсітэта ў 1816 г. асобнай структуры, якая займалася б падрыхтоўкай будучых філолагаў і праводзіла філалагічныя навуковыя даследаванні, не было, але філалагічныя дысцыпліны выкладаліся, найперш – на факультэце навук і выяўленчага мастацтва (wydział nauk i sztuk pięknych), а таксама на тэалагічным [Bieliński 1907: 37–39]. У Варшаўскай галоўнай школе (1862–1869) пачалі дзейнічаць чатыры факультэты, у тым ліку і гісторыка-філалагічны. Закладзены падмурак філалагічнай адукацыі і даследаванняў яшчэ больш умацаваны быў у межах Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта (1870–1915) і найбольшае развіццё атрымаў у Варшаўскім універсітэце.

У розныя перыяды гісторыі ўніверсітэта апрача ўласна польскай мовы ў ім выкладаліся і вывучаліся класічныя мовы, заходнееўрапейскія, усходнеславянскія і іншыя славянскія, балтыйскія, цюркскія і інш., распрацоўваліся розныя напрамкі, сярод якіх – індаеўрапеістыка, арыенталістыка, анаталійская лінгвістыка і інш.

Папярэдняя гіпотэза нашага даследавання пра тое, што беларуская мова магла трапіць у поле ўвагі выкладчыкаў Варшаўскага ўніверсітэта ў канцы XIX – на пачатку XX ст. цалкам лагічная і прадказальная – фактычна толькі з гэтага часу беларуская мова стала ўспрымацца навуко-

вай супольнасцю як самастойная ўсходнеславянская мова і ўжо ў такім статусе пачала выступаць аб'ектам навуковых даследаванняў. Паступовы пераход ад збірання беларускага фальклору да стварэння аўтарскіх твораў па-беларуску, выкарыстанне яе пісьмовай формы ў грамадскай сферы, усведамленне самастойнага характару беларускай мовы і з'яўленне навуковай цікавасці да яе як да новага ў філалагічным асяродку аб'екта ініцыявалі з'яўленне напачатку асобных навуковых публікацый, а потым і самастойных даследаванняў, прысвечаных беларускай мове.

Апісанне беларусазнаўчых зацікаўленняў пэўных філолагаў, якія мелі адносіны да Варшаўскага ўніверсітэта ў розныя перыяды яго гісторыі, прадстаўлены ў сучаснай навуковай літаратуры дастаткова шырока. Тут перадусім можна назваць прозвішчы Самуэля Ліндэ, Яўхіма Карскага, Яна Станкевіча, Базыля Белаказовіча, Антаніны Абрэмбскай-Яблоньскай і інш. Разам з тым апісальна-аналітычныя даследаванні развіцця беларусазнаўства ў Варшаўскім універсітэце канца XIX – пачатку XX стст., наколькі нам вядома, адсутнічаюць. Такія працы дапамогуць вызначыць шляхі і асноўныя напрамкі навуковага развіцця не толькі ўласна Варшаўскага ўніверсітэта, не толькі беларусазнаўства ў межах універсітэта, але і ў цэлым беларусазнаўства як асобнага напрамку.

Прадметам нашага даследавання з'яўляецца пісьмовая традыцыя беларускай мовы ў асвятленні філолагаў Варшаўскага ўніверсітэта канца XIX – пачатку XX стст. Паняцце **пісьмовая традыцыя** патрабуе тлумачэння.

Слова **традыцыя** выступае ў якасці тэрміна з адметным спецыяльным значэннем у розных навуках: гісторыі, філасофіі, грамадазнаўстве, правазнаўстве, паліталогіі, псіхалогіі, сацыялогіі, культуралогіі, мастацтве, этнаграфіі, філалогіі і інш. Яго змест дэтэрмінаваны канкрэтным навуковым напрамкам, а сама традыцыя разумеецца як складаная шматаспектная і зменлівая катэгорыя. Адзначана слова **традыцыя** і ў складзе тэрміналагічнага апарата мовазнаўства, найперш гістарычнага. Аднак яго змест не выступае аб'ектам спецыяльнай увагі саміх мовазнаўцаў і, як правіла, вынікае з кантэкстаў, успрымаецца і асэнсоўваецца інтуітыўна, з улікам агульнапашыраных уяўленняў пра традыцыю наогул. Часцей за ўсё ў мовазнаўчым дыскурсе маецца на ўвазе **пісьмовая традыцыя**, даўнасць яе паходжання, бесперапынны або перарваны характар развіцця.

Пісьмовая традыцыя – гісторыка-мовазнаўчая катэгорыя, пад якой разумеецца функцыя перадачы пісьмовага маўлення, арганізаванага і рэалізаванага ў адпаведнасці з пэўнымі ўсталяванымі звычаямі і ўстаноўкамі, якія знаходзяцца ў стане дынамічнай раўнавагі, што

абумоўлена адноснай зменлівасцю самой моўнай сістэмы (асабліва ў перыяд да складвання літаратурнай формы нацыянальнай мовы). Пры гэтым аб'ектам пісьмовай традыцыі выступае не столькі знакавая сістэма – графіка (у гісторыі беларускай мовы вядомы тры графічныя сістэмы: кірылічная, лацінская і арабская), колькі ўласна лінгвістычны і літаратурны складнікі, якія знаходзяцца ў кампліментарных адносінах. Важнымі кампанентамі ў структуры пісьмовай традыцыі выступаюць яе змест і спосабы перадачы (аб'ектныя адносіны) і стаўленне да яе саміх носьбітаў (суб'ектныя адносіны). Навуковае даследаванне сутнасці пісьмовай традыцыі павінна ўлічваць яе ўзаемадзеянне з інавацыямі [Свістунова 2021: 178–179].

Пісьмовая традыцыя беларускай мовы – шматаспектнае паняцце, звязанае з цэлым комплексам праблем: праблемай перарыву пісьмовай традыцыі, які звычайна суадносіцца з перыядам ад пачатку XVIII і да пачатку XIX ст.; праблемай пераемнасці паміж старабеларускім і перыядам новай беларускай літаратурнай мовы; праблемай перыядызацыі гісторыі беларускай літаратурнай мовы. У навуковай літаратуры гэта паняцце мае асвятленне, адпаведнае ўзроўню развіцця філалагічных ведаў наогул і ведаў пра беларускую мову і пісьменства на ёй у прыватнасці.

Далей прадстаўлена апісанне і аналіз поглядаў на пісьмовую традыцыю беларускай мовы некаторых філолагаў-славістаў, якія працавалі ў Варшаўскім універсітэце ў XIX – на пачатку XX ст.

Каралеўскі Варшаўскі ўніверсітэт (1816–1831)

Вядома, што ў час заснавання Каралеўскага Варшаўскага ўніверсітэта ў 1816 г. на пасаду рэктара прэтэндаваў Самуіл Багуміл Ліндэ (1771–1847). Праўда, яго асоба не была зацверджана прафесарскай калегіяй, аднак знакаміты філолаг-славіст выкладаў ва ўніверсітэце ў 1816–1818 гг., а потым пэўны час быў дырэктарам універсітэцкай бібліятэкі, для якой нямала зрабіў.

Пытанне пра тое, ці выкарыстоўваў С. Ліндэ факты беларускай мовы пры ўкладанні свайго фундаментальнага *Слоўніка польскай мовы* (*Słownik języka polskiego*; 1807–1814), застаецца адкрытым – на гэты конт існуюць розныя меркаванні (гл., напр.: [Запрудскі 2020: 27–29]), а вось у пазнейшых працах – *Аб славянска-расійскай літаратуры* (*O literaturze słowiańsko-rosyjskiej*; 1815–1816; рэцэнзія на бібліяграфію Васіля Сопікава), *Аб Літоўскім статуце* (*O statucie litewskim: ruskim ięzykiem i drukiem wydanym wiadomość*; 1816), у прадмове да перакладу кнігі Мікалая Грэча *Гісторыя рускай літаратуры* (*Mikołaia Grecza rys historyczny literatury rosyjskiej*; 1823) – звесткі з беларускай мовы ўжо фігуруюць. Заўважым, што ў тэрміналогіі С. Ліндэ прысутнічае характэрная

філалагічным даследаванням XIX ст. варыянтнасць у найменні беларускай мовы, якую ён называе **język Biało-rosyyjski**, **język białoruski**, **dyalekt białoruski**, **dyalekt Biało-Ruski**. Разам з тым аналагічную функцыю выконвае ў яго і тэрмін **język ruski**. Так, С. Ліндэ піша, што Францыск Скарына ў прадмове да кнігі *Эсфір* згадвае пра „сваю прыроджаную рускую мову” (“wspomina o swóim przyrodzonym ruskim języku”) [Linde 1815, III: 293]. Дарэчы, С. Ліндэ быў першым польскім навукоўцам, які ўжыў лінгвонім **беларуская мова** – у працы *Аб славянска-расійскай літаратуры* „ўпершыню ў польскамоўнай навуковай літаратуры сустракаецца выраз **беларуская мова**” [Запрудскі 2020: 18].

Па сутнасці, у С. Ліндэ лінгвонімы з часткамі **беларускі(ая)**, **рускі(ая)** суадносяцца са старажытным кірылічным пісьменствам на ўсходнеславянскіх землях (сучасных беларускіх і ўкраінскіх). Надаючы рамантычны арэал беларускай пісьмовай даўніне і разам з тым разглядаючы яе як набытак уласна польскай гісторыі і культуры, С. Ліндэ ў працы *Аб славянска-расійскай літаратуры* піша:

> далейшы ход гісторыі паказаў, што з нашага Кракава найпершыя друкі такога роду паходзілі, што Кіеў, Супрасль, Пачаеў, Нясвіж, Львоў, Вільна і г. д. былі напоўнены такімі друкамі, што імёны князёў Астрожскіх, Радзівілаў, Саламярэцкіх, Хадкевічаў і г. д. праз апекаванне імі гэтай галіны літаратуры славянскай вядомыя, што Літоўскія Статуты, першы і трэці, выйшлі па-руску, што ўсе Ягелоны ажно да Жыгімонта Аўгуста па-руску ў Літве пісалі, прывілеі і правы давалі [Linde 1815, III: 33–34].

І такім чынам, існаванне азначанай пісьмовай традыцыі рускай (а па сутнасці – старабеларускай) мовы ў адносінах да афіцыйна-справавога (канцылярскага) стылю С. Ліндэ абмяжоўвае 70-мі гадамі XVI ст. – канцом эпохі Жыгімонта Аўгуста (1520–1572).

У іншай маштабнай працы *Аб Літоўскім статуце* ў II раздзеле *Аб графіцы і мове Статута* С. Ліндэ адзначыў пранікненне рыс жывой народнай гаворкі (mowy potocznej) у дыялект бела-рускі (dyalekt Biało-Ruski), на якім напісаны тэкст са Святога Пісьма, змешчаны ў Статуце пад гербам Пагоня [Linde 1816b: 19]. На жаль, гаворка пра лёс гэтага „дыялекту” больш нідзе не ідзе, толькі ў апошнім сказе раздзела С. Ліндэ звязвае яго з гісторыяй Статута: “Dalszy zaś los tego dyalektu związany iest z Historyą tey Xięgi, o którey tu sprawę zdaiemy” [Linde 1816b: 19].

У прадмове да перакладу кнігі М. Грэча *Гісторыя рускай літаратуры* С. Ліндэ падкрэслівае неабходнасць устанавіць і захоўваць розніцу ва ўжыванні назваў славянскай, царкоўнай, рускай, маларасійскай, беларускай, сучаснай расійскай моў. Пра беларускую ён піша, што на ёй „гаворыць люд на Літве і часткова на Валыні” ([języka Białoruskiego], którym lud mówi w Litwie i po części na Wołyniu) [Linde 1823: 13].

У цэлым, як бачна, С. Ліндэ суадносіць пісьмовую традыцыю беларускай (рускай) мовы са старабеларускім перыядам і абмяжоўвае яе канцом XVI ст. Адсутнасць (ці выключная абмежаванасць?) беларускамоўнага пісьменства ў той час, калі С. Ліндэ пісаў вышэйназваныя працы (1815–1823), не дазвалялі яму звязваць гэту пісьмовую традыцыю з фактамі рэчаіснасці.

Галоўная Варшаўская школа (1862–1869)

Як вядома, адной з рэакцый улад царскай Расіі на Лістападаўскае паўстанне 1830–31 гг. стала ліквідацыя Каралеўскага Варшаўскага ўніверсітэта. Пэўны час функцыі вышэйшай навучальнай установы выконвала Галоўная Варшаўская школа (1862–1869), у якой дзейнічалі чатыры факультэты: медыцынскі, матэматычна-фізічны, права і адміністрацыі, гісторыка-філалагічны (апошні – з трыма аддзяленнямі: класічных моў, славянскіх моў, гістарычных навук). І хоць Галоўная школа праіснавала ўсяго толькі сем гадоў, ёй, безумоўна, быў зроблены істотны ўнёсак у развіццё ў Польшчы навукі і вышэйшай адукацыі.

На гісторыка-філалагічным факультэце Галоўнай Варшаўскай школы выкладаліся наступныя філалагічныя дысцыпліны: старажытнагрэчаская мова і літаратура (Антоні Межынскі, Аўгустын Шмурла), лацінская мова і літаратура (Зыгмунт Венцлаўскі, Ян Вальфрам), старaславянская мова (Юліян Каткоўскі, Пётр Палявы), польская мова (Юзэф Пшыбароўскі), польская літаратура (Адам Белцікоўскі, Аляксандр Тышынскі), руская мова (Мікалай Берг, Ян Савініч), руская літаратура (Пётр Вайнберг), чэшская мова і літаратура (Францішак Квет, Уладзіслаў Харашэўскі), англійская мова і літаратура (Францішак Кушэль), нямецкая мова і літаратура (Ян Зэйдоўскі), французская мова і літаратура (Людвік Ламберт), італьянская мова (Густаў Лазарыні), замежная літаратура (Хенрык Левістам), параўнальная граматыка славянскіх моў (Ян Паплонскі), а таксама бібліяграфія і палеаграфія (Караль Эстрайхер) [*Wykaz*… 1864–1869].

Як бачна, сярод выкладчыкаў Галоўнай Варшаўскай школы багата прозвішчаў выбітных філолагаў свайго часу. Адзін з іх, Я. Паплонскі, ва *Уступнай лекцыі ў параўнальную філалогію славянскіх моў* (*Lekcyja wstępna filologii porównawczej sławiańskiej* 1864) адносна ўкраінскай і беларускай моў выказаўся наступным чынам: „Гаворкі маларуская і беларуская ў школах наогул не вывучаюцца” (Narzeczy mało-ruskiego i biało-ruskiego w żadnych szkołach nie uczono wcale) [Papłoński 1864: 21–22]. І гэта – адзіная згадка пра беларускую мовы ва ўсім тэксце лекцыі. Зразумела, што шукаць у яе аўтара разваг пра беларускамоўную пісьмовую традыцыю ў такіх абставінах не выпадае наогул. Звернем увагу на тое, што ў той частцы, дзе гаворка ідзе пра сучаснае аўтару лекцыі

выкарыстанне розных славянскіх моў і складанне іх граматык, **малa-руская** і **беларуская гаворкі** (**narzecza**) выступаюць у адным шэрагу з **мовай вялікарускай** (**język wielko-ruski**), аднак у статусе гаворак [Papłoński 1864: 21–22].

Пасля Студзеньскага паўстання 1863–1864 гг. (паўстання Кастуся Каліноўскага ў беларускай гістарыяграфіі) Галоўная Варшаўская школа спыніла сваё існаванне. З часам многія яе выкладчыкі сталі супрацоўнікамі Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта.

Імператарскі Варшаўскі ўніверсітэт (1870–1915)

Замест Галоўнай Варшаўскай школы ад 1870 г. пачынае дзейнічаць Імператарскі Варшаўскі ўніверсітэт. Адпаведна палітыцы, што праводзілася ў Каралеўстве Польскім расійскімі імперскімі ўладамі, выкладанне і справаводства ва ўніверсітэце вялося па-руску, выкладчыцкія і кіраўніцкія пасады былі амаль недаступнымі для мясцовых палякаў. Аднак і ў такіх умовах універсітэт стаў буйным навуковым і адукацыйным асяродкам.

Першы рэктар Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта ў 1869–1872 гг. – Пётр Лаўроўскі (1827–1886) – філолаг, вядомы не толькі сваімі даследаваннямі помнікаў старажытнага славянскага пісьменства і славянскай этнаграфіі, але і русафільскімі поглядамі. Яшчэ ў бытнасць прафесарам Харкаўскага ўніверсітэта П. Лаўроўскі апублікаваў *Разбор сочинения гг. А.Н. Пыпина и В.Д. Спасовича: „Обзор истории славянских литератур”* (1867), у якім, следам за А. Пыпіным, літаратурамі рускага племені назваў рускую, маларускую і галіцка-рускую [Лавровский 1867: 14]. І калі ён робіць заўвагу ў адрас А. Пыпіна, што „о малоруссах автор не приводит литературы ни по языку, ни по истории, ни по народной словесности” і сам указвае адпаведную літаратуру [Лавровский 1867: 57], то пра беларусаў, іх мову, гісторыю і народную творчасць не згадваецца наогул. Нідзе ва ўсёй вялікай, на 76 старонак, рэцэнзіі не ідзе гаворка пра спецыфіку мовы твораў рускай літаратуры, не згадваецца існаванне беларускай або, напрыклад, „западнорусской” ці „літоўскай” мовы (‘літаратурна-пісьмовай мовы Вялікага Княства Літоўскага’).

Вядомы як збіральнік беларускай і літоўскай лексікі, аўтар даследаванняў у рэчышчы параўнальна-гістарычнага мовазнаўства Станіслаў Мікуцкі (1814–1890) працаваў на кафедры параўнальнага мовазнаўства Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта ў 1873–1888 гг. Публікацыя ў 1853–1856 гг. беларускай лексікі прынесла яму пэўную вядомасць у навуцы. Сабраныя даныя С. Мікуцкі выкарыстоўваў у сваіх пазнейшых параўнальна-гістарычных даследаваннях, разглядаючы беларускую мову ў духу заходнерусізму як „наречие” рускай мовы. Так,

напрыклад, у *Наблюдениях и замечаниях о лето-славянском языке сравнительно с прочими славянскими языками* (1867) С. Мікуцкі выкарыстоўвае азначэнне **западнорусское** (**слово**), прыводзячы ілюстрацыі з беларускай мовы [Микуцкий 1867: 6, 9, 14, 15, 20 і інш.], а дадатак-каментар да адной працы Франца Міклашыча ён пачынае так (арыгінальны правапіс захаваны):

> Державная Русь есть единственная представительница Словянства. На Руси вполнѣ сохранились основныя, коренныя Словянскія начала: – в мѣстныхъ оттѣнкахъ Русской рѣчи можно отыскать начатки, зародыши западныхъ и южныхъ Словянскихъ нарѣчій. Мелкіе и разрозненные народцы Словянскіе, изнывающие под всевозможными гнетами, – суть отпрыски громаднаго Русскаго народа [Микуцкий 1867: 611].

Навуковы інтарэс для С. Мікуцкага беларуская мова ўяўляла як адна з разнавіднасцей рускай мовы, пра існаванне асобнага беларускага пісьменства гаворка не ідзе.

Прафесарам класічнай філалогіі ў Галоўнай Варшаўскай школе, а з 1888 г. і ў Імператарскім Варшаўскім універсітэце, пэўны час дэканам гісторыка-філалагічнага факультэта быў філолаг-класік і спецыяліст па літоўскай міфалогіі Антоні Межынскі (1829–1907). Нашу ўвагу прыцягнула яго праца *Прысяга Кейстута* (*Przysięga Kiejstuta*, 1894), у якой А. Межынскі сярод іншага аналізуе „цьмяныя" словы ў лацінскім тэксце прысягі з хронік XIV ст. і робіць вывад пра тое, што „словы гэтыя маюць прыметы рускай гаворкі, можа быць – яны беларускія; па-літоўску было б ragutą ziurek, devs su mumis" (Słowa te maja cechy ruskiego narzecza, być może są białoruskie; po litewsku byłoby ragutą ziurek, devs su mumis) [Mierzyński 1894: 14]. Тут не згадваецца беларускамоўная пісьмовая традыцыя, але, па-першае, меркаванне і тлумачэнне „цьмяных" слоў, зробленае А. Межынскім, мае цікавасць для гісторыі ранняга беларускага пісьменства, па-другое, зварот да беларускай мовы сведчыць, што яна магла выступаць аб'ектам лінгвістычных даследаванняў.

У апошняй трэці XIX ст. у Імператарскім Варшаўскім універсітэце працавалі знакамітыя філолагі свайго часу. Апрача вышэйзгаданых гэта былі спецыялісты ў галіне класічнай філалогіі Мікалай Благавешчанскі (1821–1892; рэктар універсітэта ў 1872–1883 гг.), Грыгорый Зенгер (1853–1919; рэктар у 1897–1899 гг.), Сяргей Вехаў (1857–1919; рэктар у 1913–1915 гг.), Оскар Базінер (1857–1909; гады працы ва ўніверсітэце: 1897–1907); прыхільнік ідэі адзінства славян, спецыяліст па славянскай філалогіі Антоній Будзіловіч (1846–1908; рэктар у 1890–1892 гг.); спецыяліст па літоўскай і стараславянскай мовах Грыгорый Ульянаў (1859–1912; рэктар у 1899–1904 гг.); спецыяліст у галіне славянскіх старажытнасцей, гісторыі, мовы і этнаграфіі, а таксама пры-

хільнік ідэі адзінства славян Осіп Первольф (1841–1891; гады працы ва ўніверсітэце: 1871–1891); вядомы даследаваннямі па гісторыі і дыялекталогіі рускай мовы Мітрафан Коласаў (1839–1881; гады працы ва ўніверсітэце: 1871–1881); гісторык славянскага права, філолаг-славіст Фёдар Зігель (1845–1921; гады працы ва ўніверсітэце: 1873–1915) і інш.

Названыя навукоўцы, кожны з якіх быў сапраўдным спецыялістам у пэўнай галіне філалогіі, разам з тым праводзілі ў сваёй навуковай і выкладчыцкай дзейнасці палітыку расійскіх імперскіх улад, выражалі, а некаторыя з іх і вельмі актыўна прапагандавалі ідэалогію, якая зыходзіла з таго, што ўсе „окраинные русские земли” і народы павінны быць ва ўсім далучаны да карэнных рускіх. Як мага лепш гэтым мэтам адпавядалі ідэі панславізму і славянафільства з галоўным тэзісам пра першасную ролю Расіі і рускіх сярод славян і іх місію ў справе аб’яднання ўсіх славян. Гэтыя ідэі і настроі былі вельмі пашыранымі ў асяродку выкладчыкаў Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта ў апошняй трэці XIX – на пачатку XX ст. І ў цэлым, як сведчыць, напрыклад, даследаванне *Императорский университет в Варшаве: проблемы польско-российских взаимоотношений (1869–1915)*, праведзенае доктарам гістарычных навук Сяргеем Міхальчанкам, атмасфера як сярод выкладчыкаў, так і сярод студэнтаў універсітэта была дастаткова напружанай і неспрыяльнай [Михальченко 2005: 37, 42–44 і інш.].

Для ілюстрацыі пануючых у апошняй трэці XIX – на пачатку XX стст. універсітэцкіх настрояў прывядзём вытрымкі з гістарычнай працы *Может ли Россия отдать инородцам свои окраины?* (1907) прафесара Антонія Будзіловіча, які быў рэктарам універсітэта ў 1890–1892 гг.

> Таким образом, в течение двух-трех веков Русское государство раздвинулось на севере до водоската Белого моря, на юге до берегов Азовского (Сурожского), на востоке до средней Волги, а на западе до среднего течения рек Немана и Западной Двины. По течению последней, равно как и по Неве уже завязывались кое-какие сношения русских славян с прибалтийскими, еще господствовашими в те века на южных побережьях Варяжского моря [Будилович 1907: 6–7].
>
> Более того, даже столь исконные русские области, как Белая, Черная и Малая Русь, Подляшье и Холмщина, Волынь, Подолье и Украйна, наполнились в течение последнего века множеством инопленениников – польского, еврейского, немецкого происхождения – поколебавших тут не поверхность только, но и самые устои русской народности и образованности [Будилович 1907: 11–12].
>
> В Росии же западной предкам нынешних белоруссов и малоруссов пришлось целые века нести на своих плечах тяжесть государства польско-литовского, питая своими соками целые орды инородцев – магнатов, шляхтичей, монахов, бюргеров, торгашей. Даже воссоединение этих старых гнезд русской народности с Московским государством при Алексее

> Михайловиче и Екатерине II не освободило белорусов и малорусов от тяготевшего над ними гнета, а отчасти еще усилило таковой в пользу пришлых поляков, немцев, евреев [Будилович 1907: 34–35].
> Есть теперь в Белоруссии и Украйне некоторое число и русских людей, главнейше в среде образованной, которые мечтают о выделении Белоруссии и Украйны в особые автономные области, связанные с Великороссией и прочими частями государства узами федерации. При этом предполагается, что в Белоруссии должно господствовать в управлении, судах и школах местное белорусское наречие, пока вовсе еще лишенное книжной обоработки [Будилович 1907: 22].

У кантэксце нашай тэмы пэўную цікавасць маюць словы А. Будзіловіча пра тое, што беларуская гаворка (белорусское наречие) на час напісання працы (1907) зусім не мела кніжнай апрацоўкі. Можна здагадвацца, што маецца на ўвазе пад **кніжнай апрацоўкай**: выпрацоўка пісьмовай формы дадзенай мовы – і тады мы маем канстатацыю факта яе адсутнасці (што пры наяўных апублікаваных да 1907 г. творах В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны і інш., а таксама беларускамоўнага перыядычнага друку выглядае недасведчанасцю або наўмысным ігнараваннем), ці – што больш верагодна – пад кніжнай апрацоўкай тут маецца на ўвазе выпрацоўка, сістэматызацыя і ўвядзенне ў зварот літаратурных нормаў – і тады мы маем канстатацыю адсутнасці літаратурных нормаў для тагачаснай беларускай мовы, што адпавядала стану яе развіцця. Пра пісьмовую традыцыю, якая існавала ў старажытнасці на беларускіх і ўкраінскіх землях, у працы А. Будзіловіча гаворка не ішла, паколькі сама тэма гэтага не вымагала (але хутчэй за ўсё яна разглядалася б ім як пісьмовая традыцыя рускай мовы).

Можна адзначыць, што якія б то ні былі беларусістычныя даследаванні – ні на прыкладзе літаратурных ці фальклорных твораў, ні на прыкладзе гаворак (у сучасным значэнні гэтага тэрміна), ні на прыкладзе помнікаў старажытнага пісьменства (параўн. з працамі С. Ліндэ першай чвэрці XIX ст.) – філолагамі Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта ў апошняй трэці XIX ст. не праводзіліся, наколькі нам вядома на сённяшні дзень. Дзеля справядлівасці згадаем, што ў сваіх навуковых працах С. Мікуцкі выкарыстоўваў беларускую мову, А. Межынскі спарадычна звяртаўся да яе, а О. Первольф вывучаў Літоўскую Метрыку і рукапісы Імператарскай публічнай бібліятэкі падчас падрыхтоўкі шматтомнай працы *Славяне, их взаимные отношения и связи* (1886–1890) [Грот 1892: 146].

Якасны зрух у напрамку пашырэння беларусістычных зацікаўленняў трэба звязваць з прыходам ва ўніверсітэт будучага заснавальніка беларускага мовазнаўства Яфіма Карскага.

Але перш, чым звярнуцца да разгляду ў межах нашай тэмы дзейнасці гэтага філолага, выкажам адно назіранне. У той час, як бела-

русістыка ў сценах Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта фактычна не тое што не развівалася, але ў прынцыпе не існавала, філолагі ўніверсітэта займаліся – і дастаткова плённа – вывучэннем літоўскай (у сучасным значэнні гэтага лінгвоніма) мовы. Напрыклад, С. Мікуцкі вядомы не толькі як збіральнік беларускай, але і літоўскай лексікі (гл.: *Проба литовско-русского словаря* (1854); *Отчеты Второму отделению Академии наук о филологическом путешествии по западным краям России кандидата С.П. Микуцкого* (1855–56); *Наблюдения и замечания о лето-славянском языке, сравнительно с прочими арийскими языками* (1867) і інш. яго працы варшаўскага перыяду ў духу параўнальнага мовазнаўства). А. Межынскі быў аўтарам даследаванняў па літоўскай міфалогіі і выкарыстоўваў у іх факты літоўскай мовы (гл.: *Źródła do mytologii litewskiej: od Tacyta do końca XIII wieku* (1892); *Przysięga Kiejstuta* (1894); *Mythlogiæ Lituanicæ Monumenta* (ч. 1, 1892; ч. 2, 1896); *Zródla do mytologii litewskiej: wiek XIV i XV* (1896) і інш.). Г. Ульянаў яшчэ да прыходу ў Імператарскі Варшаўскі ўніверсітэт абараніў магістарскую і доктарскую дысертацыі, звязаныя з вывучэннем літоўскай мовы [*Основы настоящего времени в старославянском и литовском языках* (1889); *Значение глагольных основ в литовско-славянском языках. Ч. 1. Основы, обозначающие различия по залогам* (1891); *Ч. 2. Основы, обозначающие различия по видам* (1895)], факты якой выкарыстоўваў у пазнейшых параўнальна-мовазнаўчых даследаваннях. Ужо ў 1920-я гг. у Варшаўскім універсітэце працаваў Віктар Пажазінскі, які таксама папярэдне абараніў магістарскую і доктарскую дысертацыі па балцкіх мовах [*К истории форм спряжения в балтийских языках. Общее введение. Образование форм лица и основ времени и наклонения* (1901); *Возвратная форма глаголов в литовском и латышском языках* (1903)].

Заўважым таксама, што прыхільнікі тэорыі балта-славянскага генетычнага адзінства для наймення мовы адпаведнага перыяду выкарыстоўвалі лінгвонімы **лета-славянская** (С. Мікуцкі), **літоўска-славянская** (Г. Ульянаў, В. Пажазінскі) мова. Гэта, у сваю чаргу, карэлявала з русафільскімі ідэямі; напэўна, таму балтыстыка і атрымала пэўнае пашырэнне ў Імператарскім Варшаўскім універсітэце. Пэўнае – таму што свае асноўныя працы названыя філолагі апублікавалі, як правіла, яшчэ да пачатку дзейнасці ва ўніверсітэце.

Як адзначана вышэй, беларусістычныя даследаванні ў сценах Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта распачаліся з прыходам Я. Карскага (1861–1931). 17 верасня 1891 г. ён паспяхова здаў магістарскі экзамен на гісторыка-філалагічным факультэце гэтага ўніверсітэта, а 24 кастрычніка 1893 г. савет Кіеўскага ўніверсітэта Святога Уладзіміра прысудзіў яму навуковую ступень магістра за працу *Обзор звуков и форм белорусской речи*, якая з’яўляецца першай у гісторыі дысерта-

цыяй па беларускім моваЗнаўстве, і за працу *К истории звуков и форм белорусской речи*. Уступную лекцыю па гісторыі рускай літаратурнай мовы ў Імператарскім Варшаўскім універсітэце Я. Карскі прачытаў яшчэ раней – 27 лютага 1893 г., а з 28 кастрычніка гэтага ж года ён залічаны на кафедру рускай і царкоўнаславянскай мовы. Апрача рускай мовы Я. Карскі выкладаў дыялекталогію рускай мовы, царкоўнаславянскую мову, славянскую палеаграфію. З 26 чэрвеня 1894 г. – на пасадзе экстраардынарнага прафесара кафедры рускай і царкоўнаславянскай мовы і гісторыі рускай літаратуры. 14 снежня 1896 г. саветам Маскоўскага ўніверсітэта яму прысуджана навуковая ступень доктара філалогіі за працу *Западнорусские переводы псалтыри в XV–XVII веках*. З 14 лютага 1897 г. – ардынарны прафесар, з 1902 г. – дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта, у 1905–1910 гг. – рэктар Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта. У 1915–1916 гг. жыў у Растове-на-Доне і працаваў ва ўніверсітэце ва ўмовах эвакуацыі да яго закрыцця.

Не будзе памылкай сказаць, што варшаўскі перыяд (1893–1915) для навуковай дзейнасці Я. Карскага аказаўся самым актыўным і плённым. За гэты час ім былі напісаны і апублікаваны працы па славянскай палеаграфіі, беларускай мове, яе гісторыі, дыялекталогіі і этнаграфіі, а таксама па рускай літаратурнай мове, яе гісторыі і дыялекталогіі, якія не страцілі сваёй навуковай вартасці да гэтага часу. Іх хоць бы прыблізны пералік можа заняць некалькі старонак. Але самае галоўнае – менавіта ў варшаўскі перыяд жыцця Я. Карскага была выпрацавана канцэпцыя, збіраўся асноўны фактычны матэрыял, стваралася і пачала выходзіць з друку яго манументальная шматтомная праца *Беларусы* (Варшава–Масква–Петраград, 1903–1922), якую пазней назавуць энцыклапедыяй беларусазнаўства і найвышэйшым дасягненнем еўрапейскай славістыкі канца XIX – пачатку XX ст.

Прыглядаючыся да навуковай спадчыны Я. Карскага, няцяжка заўважыць, што, з аднаго боку, беларускую мову ён разглядаў у духу заходнерусізму як адну з рускіх гаворак, аднак, з другога боку, у сваіх даследаваннях зыходзіў з успрымання яе як мовы самастойнай. Праілюструем выказанае меркаванне.

З аднаго боку – у працах Я. Карскага *Что такое древнее западнорусское наречие*? (1893), *К истории звуков и форм белорусской речи* (1893), *Материалы для изучения белорусских говоров* (1897, 1897, 1899), *Белорусы. Язык белорусского племени. Исторический очерк звуков белорусского наречия* (1908) і інш. фігуруюць лінгвонімы **белорусское наречие**, **белорусская речь**, **белорусские говоры, (старое/древнее) западнорусское наречие** (апошні лінгвонім выкарыстоўваецца ім у адносінах да літаратурна-пісьмовай мовы перыяду ВКЛ). Лінгвонім **белорусский язык** у І томе *Беларусаў* Я. Карскі выкарыстаў у 4 раздзе-

ле, які называецца *Объединение всех белорусских племен под властью Литвы и окончательная выработка „белорусской народности” и „белорусского языка”. Заимствования из литовского и латышского языков*. І этнонім, і лінгвонім узяты ў двукоссе невыпадкова. Заўважым, што ў мовазнаўчых працах XIX ст. **беларускай** часам называлі літаратурна-пісьмовую мову эпохі ВКЛ [Запрудскі 2020: 17]. На нашу думку, менавіта ў такім значэнні ў дадзеным выпадку ўжыты Я. Карскім выраз **белорусский язык**. Манаграфія *Беларусы* выдавалася цягам 18-ці насычаных бурнымі палітычнымі падзеямі гадоў; натуральна дапусціць, што навуковыя погляды Я. Карскага за гэты час маглі змяніцца, прынамсі ў апошняй кнізе манаграфіі прысутнічаюць выразы **живая белорусская речь**, **современный нам белорусский язык**, **современная белорусская речь** [Карский 1921: 211, 215, 239] з цалкам сучасным значэннем.

З другога боку – пры стварэнні, напрыклад, этнаграфічнай карты беларускага племені да І-га тома *Беларусаў* параметрам, паводле якога размяжоўваліся беларусы і іншыя народы, выступіла менавіта мова – **белорусский говор** у тэрміналогіі Я. Карскага. Або, напрыклад, пачатак існавання арыгінальнага заходнярускага пісьменства звязваецца аўтарам *Беларусаў* з часам, калі гэтае пісьменства пачынае адлюстроўваць асаблівасці **белорусского наречия** – з XIV ст. [Карский 1921: 3–4].

Як тлумачыць сам Я. Карскі ў прадмове да І-га і ІІ-га тамоў *Беларусаў*, беларускую мову як адну з рускіх гаворак неабходна вывучаць таму і для таго, што гэта патрэбна, каб дасканала вывучыць рускую мову, яе гаворкі, гісторыю, а таксама літаратуру і этнаграфію.

> Надобность в научном словаре живого белорусского наречия и в особом словаре старого западнорусского языка очевидна для каждого занимающегося историей русского языка, югозападной литературой, западнорусской историей и этнографией, а также и для разных практических целей [Карский 1903: III].
>
> Исходя из того положения, что появление научной грамматики русского языка и его истории возможно лишь после тщательного изучения живых русских наречий и истории последних, автор во II-м томе *Белорусов* приступил к детальной разработке языка белорусского племени [Карский 1908: III].

З улікам вышэйпрыведзенных назіранняў становіцца зразумелым, што **западнорусская письменность**, як і „**белорусский язык**” [=(***старое/древнее***) ***западнорусское наречие***] для Я. Карскага – гэта часткі складанай сістэмы рускага пісьменства і гісторыі рускай літаратурнай мовы. Я. Карскі, безумоўна, быў самым дасведчаным філолагам у галіне гісторыі пісьменства на беларускіх землях, хоць і не лічыў, і не называў яго ўласна беларускім (у сучасным разуменні гэтага слова).

Найбольш грунтоўна і поўна распрацаваную і аргументаваную канцэпцыю Я. Карскага адносна станаўлення і развіцця пісьмовай традыцыі на беларускіх землях можна выявіць у манаграфіі *Беларусы* у ІІІ-м томе, які мае назву *Очерки словесности белорусского племени. 2. Старая западнорусская письменность* (Петроград, 1921), а таксама ў І-м томе *Введение к изучению языка и народной словесности* (Варшава, 1903).

У агульных рысах гэтую канцэпцыю можна прадставіць так. Пасля прыняцця хрысціянства ва ўсходніх славян пашыраецца пісьменства і – адпаведна – узнікае ўласная пісьмовая традыцыя, якая на першых парах з'яўляецца агульнай для ўсіх плямёнаў. З XIV ст. у пісьмовую мову трапляюць асаблівасці **белорусского наречия**, што дазваляе гаварыць аб нараджэнні **западнорусской письменности**, якая дасягнула росквіту ў XV–XVI стст. У выніку паланізацыі краіны і грамадства „письменность в Западной Руси естественно прекращается, оставаясь пока в Малоруссии" [Карский 2021: 17]. Прыняцце пастановы 1696 г. пра неабходнасць выкарыстання польскай мовы ў афіцыйна-справавой сферы азначыла канец заходнярускага пісьменства. Наступны перыяд у гісторыі беларускай мовы і пісьменства – **новую эпоху в белорусском языке** (**и письме кириллицей**) – Я. Карскі звязвае з канцом XVIII ст. – 1772 г., падзеламі Рэчы Паспалітай і часам, „когда белорусские области снова стали входить в тесное соприкосновение с Великоруссией" [Карский 1921: 17]. Неабходна звярнуць самую пільную ўвагу на змешчаны ў дужках выраз (и письме кириллицей). У апісанні старога заходнярускага пісьменства Я. Карскі змясціў два асобныя раздзелы, прысвечаныя пісьменству лацінскай і арабскай графікай, дзе адзначаны і час пашырэння гэтага пісьменства: камедыі з інтэрлюдыямі, напісаныя пабеларуску лацінкай, „сохранились в значительном количестве рукописей, относящихся к XVII–XVIII столетиям" [Карский 1921: 211], а кітабы захаваліся ад XVI–XVII стст., „в XVIII в. белорусские татары <…> стали пользоваться латино-польским письмом" [Карский 1921: 239]. Пачатак з'яўлення **искусственных белорусских произведений на народном языке** Я. Карскі адносіць да канца XVIII ст. Ён адзначае, што гэтыя творы былі надрукаваны толькі ў 40–60-х гг. XIX ст. і ў цэлым ацэньвае іх як недасканалыя. „Литература на белорусском наречии все же не возникла" [Карский 1903: 430], – канстатуе ён. Храналагічна першым такім творам Я. Карскі называе *Энеіду*, далей – творы Аляксандра Рыпінскага, Яна Чачота, Яна Баршчэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, Вікенція Каратынскага, а таксама ананімную паэму *Тарас на Парнасе*, згадвае „брошюры-прокломации, имевшие целью возбуждение простого народа против православной церкви и русских", – „Мужыцкую праўду" Кастуся Каліноўскага, *Гутарку старога дзеда* і некаторыя інш., а таксама **искусственные произведения**,

якія трапілі ў розныя апублікаваныя фальклорныя зборы. Толькі самыя апошнія па часе ўзнікнення творы, напісаныя па-беларуску, Я. Карскі ўключыў у раздзел *Новейшие более или менее художественные стихотворения на белорусском наречии*, куды трапілі творы Янкі Лучыны, Францішка Багушэвіча і іншыя.

Такім чынам, пісьменства на беларускіх землях Я. Карскі падзяляе на дзве часткі: **западнорусскую письменность** і – праз пэўны перапынак – **искусственные белорусские произведения на народном языке**. І калі першую ён апісваў як арыгінальную, добра развітую, то другую – як недасканалую на пачатку яе ўзнікнення і незапатрабаваную, сярод прычын чаго называе 1) адсутнасць таленавітых твораў сярод першых такіх спроб, 2) непісьменнасць „простого народа", 3) генетычную блізкасць „народного белорусского языка к южновеликорусскому вследствие чего, если опустить в напечатанном этимологически белорусском произведении дзеканье, цеканье, то получится почти общелитературное произведение, отличающееся только меншей отделкой и, следовательно, менее достойное внимания читателя" [Карский 1903: 431]. Неабходна мець на ўвазе і тое, што Я. Карскі піша пра заняпад заходнярускага пісьменства, маючы на ўвазе яго кірылічную і арабаграфічную разнавіднасці; гэтае ж назіранне ў адносінах да лацінаграфічных тэкстаў ён не пацвярджае.

У якасці агульнага заключэння трэба прызнаць, што рабочая гіпотэза нашага даследавання атрымала пацвярджэнне толькі часткова: сапраўды, вывучэнне беларускамоўнай пісьмовай традыцыі ў рэчышчы беларусістыкі атрымала пашырэнне ў Варшаўскім універсітэце толькі ў самым канцы XIX – на пачатку XX ст. у працах Я. Карскага. Але фактычна дзейнасцю гэтай асобы ў час існавання Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта яно (вывучэнне) і вычэрпваецца, можна, праўда, згадаць, што С. Мікуцкі выкарыстоўваў факты беларускай мовы ў сваіх параўнальна-гістарычных працах, спарадычна звяртаўся да яе А. Мяжынскі, а О. Первольф вывучаў Літоўскую Метрыку і старажытныя рукапісы. У больш ранніх працах 1815–1816 гг. старажытнаму беларускаму пісьменству шмат увагі надаваў С. Ліндэ.

І хоць у сценах Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта ў апошняй трэці XIX – на пачатку XX ст. працавала нямала вядомых філолагаў, славянафільскае асяроддзе не спрыяла вывучэнню азначанай тэмы і беларусістычным даследаванням, якія набылі актуальнасць і сталі прыносіць плён ужо ў Варшаўскім універсітэце ў XX ст. Адзінае выключэнне складае Я. Карскі, у працах якога прадстаўлены той погляд на існаванне беларускамоўнай пісьмовай традыцыі, які ў далейшым стане пануючым і адпаведна якому паміж старабеларускім перыядам і новой эпохай у беларускай мове існаваў пэўны беспісьмовы час.

Бібліяграфія

Ânuškevìč Âzèp, Cvìrka Kastus'. 2001. *Âŭhìm Karskì ì âgo „Belarusy"* (5–30) U: Karskì Â. *Belarusy*:. Mìnsk: Belaruskì knìgazbor [Янушкевіч Язэп, Цвірка Кастусь. 2001. *Яўхім Карскі і яго „Беларусы"* (5–30) У: Карскі Я. *Беларусы*:. Мінск: Беларускі кнігазбор].

Bieliński Józef. 1907. *Królewski Uniwersytet Warszawski (1816–1831)*, t. 1. Warszawa: [s. n.], (Kraków: W. L. Anczyc).

Budilovič Antonij. 1907. *Možet li Rossiâ otdat' inorodcam svoi okrainy?* S.-Pbg.: Tip. A.S. Suvorina [Будилович Антоний. 1907. *Может ли Россия отдать инородцам свои окраины?* С.-Пбг.: Тип. А.С. Суворина].

Grot Konstantin. 1892. *O.O. Pervol'f: nekrolog*. „Žurnal Ministerstva narodnogo prosveŝeniâ", č. CCLXXIX: 141–150 [Грот Константин. 1892. *О.О. Первольф: некролог*. „Журнал Министерства народного просвещения", ч. CCLXXIX: 141–150].

Karskij Efim. 1903. *Belorusy.* Tom I: *Vvedenie k izučeniû âzyka i narodnoj slovesnosti.* Varšava: Tip. Varš. uč. okruga [Карский Ефим. 1903. *Белорусы.* Том I: *Введение к изучению языка и народной словесности*. Варшава: Тип. Варш. уч. округа].

Karskij Efim. 1908. *Belorusy.* Tom II: *Âzyk belorusskogo plemeni. 1. Istoričeskij očerk zvukov belorusskogo narečiâ* [Карский Ефим. 1908. *Белорусы.* Том II: *Язык белорусского племени.* 1. *Исторический очерк звуков белорусского наречия*. Варшава: Тип. Варш. уч. округа].

Karskij Efim. 1921. *Belorusy.* Tom III: *Očerki slovesnosti belorusskogo plemeni. 2. Staraâ zapadnorusskaâ literatura.* Petrograd: 12-â Gosud. Tipografiâ [Карский Ефим. 1921. *Белорусы*. Т. III: *Очерки словесности белорусского племени*. 2. *Старая западнорусская литература*. Петроград: 12-я Госуд. Типография].

Lavrovskij Pëtr. 1867. *Razbor sočineniâ gg. A.N. Pypina i V.D. Spasoviča: „Obzor istorii slavânskih literatur".* V: *Otčet o devâtom prisuždenii nagrad grafa Uvarova*: 11–87. SPb.: V Tip. Imper. Akad. nauk [Лавровский Пётр. 1867. *Разбор сочинения гг. А.Н. Пыпина и В.Д. Спасовича: „Обзор истории славянских литератур"*. В: *Отчет о девятом присуждении наград графа Уварова*: 11–87. СПб.: В Тип. Импер. Акад. наук].

Linde Samuel. 1815–1816a. *O literaturze słowiańsko-rosyjskiej.* „Pamiętnik Warszawski" 1815, t. 2 (sierpień): 411–428, t. 3 (wrzesień): 14–34, t. 3 (październik): 133–150, t. 3 (listopad): 277–298; 1816, t. 4 (styczeń): 3–21, t. 4 (marzec): 285–296, t. 5 (maj): 3–21, t. 5 (czerwiec): 125–144.

Linde Samuel. 1816b. *O statucie litewskim: ruskim ięzykiem i drukiem wydanym wiadomość.* Warszawa: J. Zawadzki i J. Węcki.

Linde Samuel. 1823. *Mikołaia Grecza rys historyczny literatury rossyyskiey, z dodatkami z Batjuszkowa, Bestużewa, Bulharyna [et al.].* Warszawa: N. Glücksberg.

Mierzyński Antoni. 1894. *Przysięga Kiejstuta*. Poznań: [s. n.]. (W Druk. Dziennika Pozn.).

Mihal'čenko Sergej. 2005. *Imperatorskij universitet v Varšave: problemy pol'sko-rossijskih vzaimootnošenij (1869–1915).* „Slavica Ludensia" t. 22: 33–46 [Михальченко Сергей. 2005. *Императорский университет в Варшаве: проблемы польско-российских взаимоотношений (1869–1915)*. „Slavica Ludensia" t. 22: 33–46].

Mikuckij Stanislav. 1867. *Nablûdeniâ i zamečaniâ o leto-slavânskom âzyke sravnitel'no s pročimi slavânskimi âzykami.* S.-Pbg.: Tip. Kukol'-Âsnopol'skogo [Микуцкий Станислав. 1867. *Наблюдения и замечания о лето-славянском языке сравнительно с прочими славянскими языками*. С.-Пбг.: Тип. Куколь-Яснопольского].

Papłoński Jan. 1864. *Lekcyja wstępna filologii porównawczej sławiańskiej miana dnia 28 października – 9 listopada 1864 r. w Szkole Głównej Warszawskiej*. Warszawa: K. Kowalewski.

Svìstunova Maryna. 2021. *Pìs'movaâ tradycyâ: movaznaŭčy aspekt panâccâ*. U: *Sbornik naučnyh trudov členov Soûza ženŝin BGU*: 171–179. Minsk: RIVŠ [Свістунова Марына. 2021. *Пісьмовая традыцыя: мовазнаўчы аспект паняцця*. У: *Сборник научных трудов членов Союза женщин БГУ*: 171–179. Минск: РИВШ].

Wykaz Szkoły Głównej Warszawskiej. 1864–65 № 2: 42–43, № 3: 100–101; 1865–66 № 4: 11–14, № 5: 36–39; 1866–67 № 6: 29–32, № 7: 36–39; 1867–68 № 8: 28–31, № 9: 10–13; 1868–69 № 10: 56–59.

Zaprudskì Sârgej. 2020. *Narysy gìstoryì belaruskaga movaznaŭstva XIX stagoddzâ*. Mìnsk: BDU [Запрудскі Сяргей. 2020. *Нарысы гісторыі беларускага мовазнаўства XIX стагоддзя*. Мінск: БДУ].

ABSTRACT: In the article, the Belarusian interests of Slavists who worked at the University of Warsaw in the XIX – early XX centuries are described and analyzed (at different times: Royal University of Warsaw, Main School of Warsaw, Imperial University of Warsaw). The writings, which now belong to Belarus, in the beginning XIXth century attracted the attention of S. Linde and in the end XIXth century – that of J. Karsky. The first, because of objective reasons, could not consider its gradual development, and the second made a thorough description, noting the cessation of „Western Russian writing" (in Cyrillic and Arabic versions).

Keywords: written tradition, Belarusian studies, Slavic philologists, University of Warsaw.

STRESZCZENIE: W artykułe ukazano i przeanalizowano zainteresowanie białorutenistyką filologów-slawistów, którzy w XIX i na początku XIX wieku pracowali na Uniwersytecie Warszawskim (w różnych okresach był to Królewski Uniwersytet Warszawski, Szkoła Główna Warszawska, Cesarski Uniwersytet Warszawski). Zabytki, które obecnie należy uważać za białoruskie na początku XIX wieku przyciągnęły uwagę S. Lindego, a od końca XIX wieku – J. Karskiego. Pierwszy z obiektywnych powodów nie mogł rozważać o stopniowym rozwoju tego piśmiennictwa, drugi dokonał jego dokładnego opisu, odnotowując zanik „pisma zachodnioruskiego" (odnośnie łacińskiego i arabskiego systemu graficznego).

Słowa kluczowe: tradycja pisemna, białorusistyka, philologowie-slawiści, Uniwersytet Warszawski.

РЭЗЮМЭ: У артыкуле пададзена апісанне і аналіз беларусістычных зацікаўленняў філолагаў-славістаў, якія ў XIX – на пачатку XX ст. працавалі ў Варшаўскім універсітэце (у розныя часы – Каралеўскі Варшаўскі ўніверсітэт, Галоўная Варшаўская школа, Імператарскі Варшаўскі ўніверсітэт). Пісьменства, якое ў сучаснасці адносіцца да беларускага, на пачатку XIX ст. прыцягвала ўвагу С. Ліндэ, а з канца XIX ст. – Я. Карскага. Першы па аб'ектыўных прычынах не мог разглядаць яго стадыйнае развіццё, другі зрабіў грунтоўнае апісанне, адзначыўшы заняпад „заходнерускага пісьменства" (у кірылічнай і арабаграфічнай разнавіднасцях).

Ключавыя словы: пісьмовая традыцыя, беларусістыка, філолагі-славісты, Варшаўскі ўніверсітэт.

Data przesłania artykułu: 29.11.2021
Data akceptacji artykułu: 12.12.2021

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Марына Свістунова / Maryna Svistunova – Białoruś, Białoruski Uniwersytet Państwowy, Katedra językoznawstwa białoruskiego; dr, docent; specjalność naukowa: historia języka białoruskiego; zainteresowania naukowe: język białoruski w XVI–XVIII ww.

Adres: Katedra językoznawstwa białoruskiego Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego, ul. Karla Marksa 31, 220030 Mińsk, Białoruś.

Wybrane publikacje (2020–2021):

1. Свістунова Марына. 2020. *Лінгвонімы ў творах рэлігійнай палемікі канца XVI – пачатку XVII ст.* (91–108). У: *Актуальныя аспекты беларусістыкі: Матэрыялы VI Міжнароднага кангрэса беларусістаў (Мінск, 27–29 мая 2015 г.): Зборнік артыкулаў*. Мінск: Кнігазбор.
2. Свістунова Марына. 2020. *Да пытання пра аўтарства дзвюх частак Жыровіцкага рукапісу пачатку XVII ст.: моўны аналіз* (24–29). У: *Матэрыялы XVI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў: да 500-годдзя заснавання Жыровіцкага манастыра і бібліятэкі (Мінск, 15 мая 2020 г.)*. 2-е выд. Мінск: НББ.
3. Свістунова Марына. 2020. *Да праблемы пераемнасці беларускай літаратурнай мовы: лацінаграфічныя тэксты XVIII стагоддзя*. „Acta Albaruthenica” 20: 239–253.
4. Свістунова Марына. 2021. *Беларускамоўныя лацінаграфічныя тэксты XVIII ст. у справе вырашэння праблемы перарыву пісьмовай традыцыі*. „Роднае слова” № 1: 30–34.
5. Свістунова Марына. 2021. *Пісьмовая традыцыя: мовазнаўчы аспект паняцця* (171–179). В: И.В. Казакова (ред.) *Сборник научных трудов членов Союза женщин БГУ: к 100-летию БГУ*. Минск: РИВШ.